# ПАЭТЫЧНЫ ДЭНДРАРЫЙ У ЛІРЫЦЫ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА: СЕМАНТЫКА І ФУНКЦЫЯНАВАННЕ

*Т.П. Слесарава*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

25 ліпеня 2024 года споўніцца 40 гадоў, як перастала біцца сэрца Уладзіміра Сямёнавіча Караткевіча – тонкага лірыка, чыя паэтычная спадчына накіравана на ўслаўленне прыгажосці роднага беларускага краю.

Для апісання вобразаў роднай прыроды паэт выкарыстоўвае самую разнастайную лексіку. Але самі па сабе лексічныя адзінкі не зробяць мову маляўнічай і выразнай. Гэта майстар слова выкарыстоўвае іх у якасці вобразных выразаў суб'ектыўнага ўяўлення аб прадмеце або з'яве.

Артыкул напісан ў рамках кафедральнай тэмы “Традыцыі і навацыі ў развіцці мовы і культуры Беларускага Паазер’я”, № ДР 20210510 ад 05.04.2021 г. задання 6.1.08 “Беларуская мова: этналінгвістычны, сацыялінгвістычны і лінгвакультуралагічны аспекты даследавання” падпраграмы «Беларуская мова і літаратура» дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў «Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы» на 2021-2025 гады з мэтай вырашэння задачы вызначэння асноўных падыходаў да распрацоўкі мадэлі лінгвістычнага партрэта рэгіёна.

На наш погляд, вызначэнне месца фітонімнай лексікі ў паэтычнай карціне свету пэўнага аўтара з'яўляецца актуальным. Адсюль і мэта дадзенай працы – разгледзець групу слоў, якія адносяцца да дэндронімаў, з пункту гледжання іх семантыкі і ўжывання ў паэтычных тэкстах Уладзіміра Караткевіча.

**Матэрыял і метады.** Нашы назіранні пабудаваны на матэрыяле тэкстаў вершаў з першага тома збору твораў Уладзіміра Караткевіча [1]. Для даследавання мы выкарыстоўвалі апісальны і стылістычны метады.

**Вынікі і іх абмеркаванне**. Родная прырода выступае ў паэзіі Уладзіміра Караткевіча не проста тэмай - яна пэўным чынам адлюстроўвае філасофскія погляды паэта, яго эстэтычны ідэал.

Таму словы-рэпрэзентатары расліннага свету, у прыватнасці, назвы дрэў, у якасці выяўленча-выразных сродкаў сустракаюцца ў тэкстах вершаў Караткевіча даволі часта. Намі зафіксавана 30 найменняў розных дрэў: *бяроза, дуб, каліна, кіпарыс, ліпа, сасна, таполя, рабіна, яблыня* і іншыя.

Самым частотным ужываннем з'явіўся дэндронім *дуб* (18 словаўжыванняў). Гэта дрэва як у фальклоры, так і ў паэзіі выступае сімвалам жыццёвай сілы, моцы, вынослівасці, даўгалецця, высакароднасці і славы.

*І **дубы** ў малочным тумане*
*Веліканамі ціха стаяць [*1, с.52*].*

*Ад дажджу пачарнеў небарака-дом*
*І **дубоў** магутных слупы [*1, с.49*].*

*Над берагам зялёным явар звонкі*
*І моцныя, спрадвечныя **дубы** [*1, с.311*].*

Шмат давялося выпрабаваць і вынесці беларускаму народу, але ён, як дуб, які ламаў і карэжыў лёс, стаіць моцна і непахісна:

*Бо мы народ вялікі, непарушны,*
*Народ, што да зямлі прырос, як **дуб** [*1, с.315*].*

Паэт задаецца пытаннем:

*Што вы варты без гэтай магілы,*
*Без **каліны** на роднай мяжы?*
*Без **дубоў,** што ў тумане млеюць,*
*Без расы на роднай траве?* [1, с.53].

Няма ў нашым лесе дрэва больш паэтычнага, чым *бяроза.* Гэтая лексема ў аналізаваных тэкстах намі зафіксавана 12 разоў.

Пра бярозу складзена шмат песень, яна з'яўляецца ўлюбёным матывам пейзажнага жывапісу. Рускі мастак Ігар Грабар казаў: «Што можа быць выдатней бярозы, адзінага ў прыродзе дрэва, ствол якога асляпляльна-белы, тады як усе астатнія дрэвы на свеце маюць цёмныя ствалы. Фантастычнае, звышнатуральнае дрэва, дрэва-казка».

Стройную, кучаравую, беластвольную прыгажуню параўноўваюць з пяшчотнай і прыгожай дзяўчынай. Акрамя таго, бяроза спрадвеку дрэва-сябар: з бяросты сяляне майстравалі кошыкі, лапці, кара бярозы калісьці з'ўлялася асноўным матэрыялам, на якім вучыліся напісанню літар, пісалі лісты.

*Над спакойны і радасны дом над Акою*
*Нахіляюць зялёныя косы **бярозы*** [1, с.173].

*Вечар зацяпліў **бярозак** свечы* [1, с.177].

*Але ўсё ж праз туманна-дрыжачыя слёзы,*
*Бы з карцінкі зводнай у тонкіх руках,*
*Бачны жоўтыя павесмы ніцай **бярозы***
*І чароды на сумных асенніх лугах* [1, с.189].

Многае маглі б расказаць бярозы аб страшнай трагедыі Вялікай Айчыннай вайны, паколькі, паводле звычаю, над магілай загінулага салдата саджалі бярозу, каб яго жыццё працягвалася ў зямным дрэве. Бярозы – гэта наша памяць:

*Іх укрылі дзяругай, паклалі на воз*
*І павезлі па вёсках, па чорных пажарышчах*
*Каля чорных абвугленых мёртвых **бяроз*** [1, с.61].

*Я знаю, як гінуць нашы **бярозы**:*
*Без плачу* [1, с.231].

Дэндронімы арганічна і матывавана ўліваюцца ў сістэму моўных сродкаў і ярка малююць панараму навакольнай рэчаіснасці, з'яўляючыся свайго роду сімваламі для адлюстравання разнастайных успамінаў, роздумаў, перажыванняў аўтара, выказвання яго думак і ўражанняў:

*Вось дом стары. Два **клёны** і **таполя,***
*Як старыкі аперліся на дах* [1, с.317].

*Ў гэтым горадзе, дзе златабрамскі сквер*
*Зараз, пэўна, ад ветру пажоўк,*
*Ёсць любімы раён, што завецца «Пячэрск»,*
*Ёсць **каштаны** ў імжацы дажджоў* [1, с.50].

*У музейным завулку дом стаяў асаблівы.*
*Звонку хата як хата. **Дубы.** Гарод.*

*Дзесяць **яблынь** белых. Старыя **слівы.***
*Хмель і плюшч спавіваюць высокі плот* [1, с.95].

*Я гэту **яблыню** тады саджала,*
*І дачакалася яна цябе* [1, с.67].

*Хутка між **яблынь** густых*
*Будзеш смяяцца і ты* [1, с.69].

Караткевіч стварае мілыя свайму сэрцу карціны, малюючы жыццё прыроды і жыццё чалавека ў іх адзінстве на фоне кругазвароту пор года. Разам з аўтарам чытач бачыць і «*маладыя, пушыстыя лісцейкі **грушы***», і «***вербы** ў дымнай расе»,* і «*зімовы россып **каліны**»,* і «*у дажджы пух **таполяў**»,* і тое, як «*тачылася з **вішняў** смала»,* і як «*асцярожнае сонца з голых **асін** выпаўзае на ціхі сінічы свіст*», і як «***каштаны** квітнелі вясной»,* «*на адхонах **ліпы** мокнуць»,* а «*на ўсіх баравых **рабінах** чырвоныя плахты вісяць»* і чуе, як «*над зямлянкай **яліна** рыпіць крывая»,* і «*хрушчы басяць над **клёнамі**»,* і «*над галавою **дуб**, расколаты бомбай, тужліва рыпеў».*

У паэта прырода не толькі выдатная, але і адухоўленая, яна можа сумаваць і адчувае сябе па-чалавечы. Таму Караткевіч часта звяртаецца да прыёму ўвасаблення і параўнання: «***явар** сумны і адзінокі пахіліў задумёны стан»,* «*чакаюць **вішні** белых пакрывалаў», «сястра мая, бяздольная **асіна**, апошняю лістотай не дрыжы*», «***яліна** над сцежкай маёй – не **яліна**, а баба-яга».*

Майстар слова, дэталі, Караткевіч-рамантык здольны ўбачыць рэальнасць не толькі такой, якая яна ёсць, але і іншай, незвычайнай, экзатычнай, яркай. Паэт прызнаецца:

*Я ўсё жыццё хацеў*
***Алівы** ўзрошчваць* [1, с.160].

І хай там, у далёкай, чужой старане «***бяроз** няма. Адны **кіпарысы**»,* паэт усклікае:

*Тыя цёмныя **цісы** і цёмныя **кіпарысы**,*
*Тыя зарасці лаўраў і леташняй ссохлай травы…*
*Не забуду я іх* [1, с.214].

Караткевіч любуецца, як «***міндаль** палыхае, як лава, і персікаў белыя крылы»,* бачыць «***эўкаліптаў** лёгкіх пер'е», «у тумане – **кіпарысы** цёмныя», «**туі**, Іудзіна дрэва і пілы **агаваў**», «і над вокнамі косы звесіла **пальма** поўдня» и «**кедр** каханы з паўночных вышынь».*

У паэтычным дэндрарыі Уладзіміра Караткевіча ёсць і «***язміну** кветка на марозе»,* і «*у вільготнай пахучай цемры **магнолій** белы падман»,* кветкі якіх «*так салодка дураць і так спавіваюць, што ні людзям, ні скалам дрымотай не ўзняць* галавы», і «*першы жоўты ліст на галінах **акацыі**»,* і «*залацістая **мімоза***», і ***вяргіні,*** якія «*як лёд, стаяць, усе абвітыя ў павой»,* і, вядома ж, «*шалёны **бэз,** вільготны **бэз***».

**Заключэнне.** Такім чынам, дэндранімная лексіка ў лірыцы Уладзіміра Караткевіча выступае важным сродкам адлюстравання філасофскага і эстэтычнага ідэалу паэта. А жывыя карціны прыроды ў вершах вучаць чытачоў любіць і захоўваць свет зямной прыгажосці.


1. Караткевіч, У. Збор твораў: У 8 т. Т.1. Вершы, паэмы / У. Караткевіч. – Мн.: Мастацкая літаратура, 1987. – 431 с.
2. Русецкі, А. Уладзімір Караткевіч Праз гісторыю ў сучаснасць / А.Русецкі. - Мн.: Маст.літ., 2000.-300с.
3. Белорусское Поозерье на ономастическом ландшафте малой родины : монография / А. М. Мезенко [и др.] ; под науч. ред. А. М. Мезенко ; М-во образования Республики Беларусь, Учреждение образования "Витебский государственный университет имени П. М. Машерова". – Витебск : ВГУ имени П. М. Машерова, 2023. – 199 URL: https://rep.vsu.by/handle/123456789/39666 (дата обращения: 29.01.2024).